ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1981
28
МАЯ
ЧАЦВЕР
№ 21 (1321)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

"Беларускі універсітэт"

тэлетайп

«Учора • Сёння • Заўтра»

ВУЧЭБНЫМ АБАНЕМЕНТАМ

універсітэцкай бібліятэкі арганізавана выстаўка-агляд падручнікаў і дапаможнікаў розных гадоў выдання. 532 экземпляры кніг па матэматыцы, праграмiраванню, хімічнай тэхналогіі, фізіцы, тэхнічных дысцыплінах, біялогіі, геаграфіі, гуманітарных навуках прагледжаны наведвальнікамі. Выкладчыкі многіх кафедр зрабілі рэкамендацыі аб выкарыстанні прадстаўленай літаратуры ў вучэбным працэсе.

І. БАРДЗІЯН,
супрацоўніца бібліятэкі.

100-ГОДДЗЮ

з дня нараджэння М. М. Баранскага, аднаго з заснавальнікаў савецкай эканамічнай геаграфіі, члена-карэспандэнта АН СССР прысвячаўся агульны сход супрацоўнікаў геафака і членаў геаграфічнага таварыства.

Пра жыццёвы шлях вядомага вучонага і яго ролю ў станаўленні савецкай эканомгеаграфіі расказаў прафесар І. І. Трухан. Уклад М. М. Баранскага ў вывучэнне эканамічнай геаграфіі замежных краін раскрыў перад слухачамі прафесар М. Т. Раманоўскі. Пра асобныя бакі навуковай дзейнасці вядомага савецкага географа паведамілі доктар геаграфічных навук С. А. Польскі, прафесар В. А. Жучкевіч, дацэнт В. Я. Крышчановіч.

А. ЛАЗОЎСКІ.

ЗАВЯРШЭННЮ

навучальнага года ў сетцы партыйнай вучобы была прысвечана канферэнцыя на фізічным факультэце. Прысутныя праслухалі лекцыі «Галоўная задача XI пяцігодкі і шляхі яе рэалізацыі», «Асноўныя прапорцыі XI пяцігодкі», «Развіццё сацыяльна-класавых адносін савецкага грамадства».

В. МАСКАЛЁЎ.

КІНАЛЕКТОРЫЙ

«Кіно і час» збірае ў актавай зале універсітэта вялікую аўдыторыю слухачоў. Зацікавіла студэнтаў лекцыя мастацтвазнаўцы А. А. Хларовіч «Кінематограф у стыле «рэтра», якая суправаджалася дэманстрацыяй фрагментаў з фільмаў «Канфарміст», «Прызнанне ў каханні» і інш. Прысутныя прагледзелі кінастужку «Пяць вечароў».

В. ЛАПІКАЎ.



● АБАРОНА ДЫПЛОМНЫХ РАБОТ

ЗАЦВЯРДЖЭННЕ СТАЛАСЦІ

...ІДЗЕ АБАРОНА дыпломных праектаў студэнтаў V курса гістфака. Я трапіў сюды зусім выпадкова. Ішоў з бібліятэкі, і вось—знаёмы голас, твар...

Успомніліся дні лета-80, праведзеныя ў далёкай Якуціі: праца, экскурсіі, цікавыя сустрэчы, выступленні агітбрыгады. У той час пяцікурснік Пётр Аксючыц быў камандзірам і душой усяго нашага будаўнічага атрада імя Ленінскага камсамола Беларусі, што дыслакаваўся ў Нерунгры.

Кіраўнік і душа калектыву. Такія якасці гарманічна сумяшчаць у сабе здольны не кожны камандзір. І хто дабіваецца гэтага—вынік адразу відаць. І сумненняў быць не можа. Праверана ўжо шматгадовай практыкай будатрадаўскага руху.

Вось такім быў наш камандзір Пеця. Яго выгараўшую на 40-градусным сонцапёку чырвоную кашулю заўважалі на аб'екце яшчэ здалёк. Ведалі, што проста так не ідзе. Ёсць, значыць, нейкае новае рашэнне. Патрабуецца канкрэтная размова з брыгадзірамі, а калі трэба—згода ўсіх байцоў. І яго рашэнні заўсёды падтрымлівалі таму, што былі яны добра абдуманымі, пасапраўднаму камандзірскімі...

Сёння член КПСС Пётр Аксючыц абараняе дыпломную работу, тэма якой—«Роля СБА ў камуністычным выхаванні студэнцкай моладзі». Тэма не з лёгкіх. Але такая блізкая і дарагая яму, чалавеку, які не ўяўляў, не бачыў сябе летам без калектыву, сапраўднага, па-баявому настроенага студэнцкага калектыву.

Пятру Аксючыцу ёсць аб чым сказаць у сваёй рабоце...

В. ТАБУЛІН.

На здымках: дыпломную работу абараняе Пётр **Аксючыц**; уважліва слухае дзяржаўная камісія выступаючых.

Фота **В. Шачака.**

● ПА СТАРОНКАХ КНІГ

ТЫЯ, ХТО ВЫСТАЯЎ

ЗУСІМ нядаўна мы зноў глядзелі «Блакаду» па тэлевізару — і вось нібы сышлі з экрана ўдзельнікі гераічнай абароны горада Леніна. Сустрэчу э імі, толькі пастарэўшымі на 40 гадоў, адкрыў дэкан факультэта прыкладной матэматыкі В. І. Карзюк.

На канферэнцыю чытачоў, якая арганізавана на ФПМ аддзелам абслугоўвання універсітэцкай бібліятэкі сумесна з кафедрай рускай і савецкай літаратуры філфака, запрошаны аўтар кнігі «Аб тых, хто выстаяў» М. П. Яругін, Герой Сацыялістычнай працы, акадэмік АН БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, заслужаны дзеяч навукі БССР, былы камандзір узвода супрацьтанкавай артылерыі, а зараз — рэдактар усесаюзнага часопіса «Дыферэнцыяльныя ўраўненні», які выдаецца ў СССР і ЗША; яго аднапалчане А. С. Паўлавец і А. Ф. Коншын, а таксама ветэран вайны, сябар Мікалая Паўлавіча яшчэ па камсамольскай ячэйцы П. І. Чаранкоў.

— Літаратурныя канферэнцыі з удзелам вядомых людзей, герояў кніг ва універсітэце сталі добрай традыцыяй, — адзначыў ва ўступным слове дацэнт кафедры рускай і савецкай літаратуры, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны У. С. Карабан.

Падрабязней аб кнізе — помніку гераічнаму Ленінграду і сваіх уражаннях аб ёй расказалі студэнты-матэматыкі Сяргей Бядулін, Людміла Радзіванюк, Алена Шчурэвіч, Аліна Марозава.

Цяжкасці 900 дзён абароны, станаўленне М. П. Яругіна як камандзіра, яго ваенны шлях, мужнасць і гераізм савецкіх салдат і афіцэраў, будні ўзвода супрацьтанкавай артылерыі на Ленінградскім фронце — тэмы, якія знайшлі адлюстраванне ў гэтых выступленнях.

У заключэнне сустрэчы ўспамінамі аб перажытым падзяліліся з моладдзю ветэраны апошняй вайны — тыя, хто выстаяў.

А. РУКШЫН,
загадчык аддзела абслугоўвання бібліятэкі.

ТРАДЫЦЫЙНЫ ЗЛЁТ СТУДЭНТАЎ-ФІЛОЛАГАЎ

Тады і быў уласнаручны Падпісан ленінскі дэкрэт: Адкрыць у Мінску Беларускі Дзяржаўны універсітэт... — гучыць звонкі голас над вясновай палянай, над радамі святочна ўпрыгожаных палатак, над шарэнгамі студэнтаў і гасцей. Чарговы злёт студэнтаў-філолагаў на радзіме Янкі Купалы, вялікага беларускага песняра, прысвячаецца сёлета 60-годдзю стварэння Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Свята, да якога на працягу амаль усяго навучальнага года рыхтуецца філалагічны факультэт, праводзіцца ўжо ў пяты раз і, зразумела, мае свае традыцыі: урачыстае шэсце па вуліцы Карла Маркса, ускладанне кветак да памятнага Знака загінуўшым выкладчыкам, студэнтам і супрацоўнікам універсітэта...



На мітынгу, прысвечаным адкрыццю злёту, пасля рапартаў, якія здавалі камандзіры курсавых атрадаў і факультэцкіх СБА сакратару камітэта камсамола Таццяне Сотчанка, пасля пераклічкі сакратароў мінулых гадоў і іх расказаў пра слаўны шлях камсамоліі філфака, пасля віншаванняў, з якімі выступілі дэкан факультэта А. А. Волк, сакратар парткома БДУ М. Г. Елісееў, пляменніца Я. Купалы Я. Ю. Раманоўская, слова па традыцыі прадастаўляецца выкладчыкам факультэта — ветэранам вайны. Ад іх імя звяртаецца да прысутных дацэнт кафедры беларускай літаратуры Л. Л. Кароткая. У заключэнне яе выступлення ўзлятае над прыціхлай палянай вядомы купалаўскі верш «Беларускім партызанам» — так чытала яго сябрам па зброі былая партызанка амаль 40 гадоў назад.

Кальша ветрык сцяг злёту. Узнялі яго ў гэтым годзе сакратар камітэта камсамола філфака 1970—1972 гадоў І. А. Рабчынская, сакратар 1972—1975 гадоў Л. Т. Агароднік; студэнтка II курса, член камітэта камсамола факультэта Т. Міхалевіч, камсорг II курса Л. Драко, купалаўская стыпендыятка, чацвёртакурсніца А. Лісоўская, камсорг IV курса В. Сідарэнка.

Насычаная праграма даваляе кожнаму ўдзельніку свята цікава і змястоўна правесці час: працоўны дэсант, экскурсія па музею паэта, конкурс на лепшае афармленне палатак, спаборніцтвы па футболу і валейболу, прэс-канферэнцыя з выпускнікамі, конкурс повараў, спартыўная эстафета, канцэрт мастацкай самадзейнасці...

Пачынаючыя факультэцкія паэты і выдатнікі вучобы ўскладаюць кветкі да помніка вялікаму песняру. Тут сабраліся аматары сакавітага беларускага слова на традыцыйную «гадзіну паэзіі», якую адкрыў беларускі паэт, кіраўнік універсітэцкага літаратурнага аб'яднання «Узлёт», прафесар Алег Антонавіч Лойка.

Імёны тых, хто прынёс сюды свае вершы, мы часта сустракаем на літаратурных старонках газет. Гэта Алена Парфеявец і Сяргей Чыгрын, Кастусь Цыбульскі, Ала Канапелька, Сяргей Сакалоў... Чытаюць тут свае творы і сябры «ўзлётаўцаў» — члены літаб'яднання педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага «Крокі», запрошаныя да ўдзелу ў злёце. І здаецца, задуменна слухае Купала сваіх нашчадкаў...

Народнай песняй вітае прысутных госць студэнцкага свята фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Вячоркі» з вескі Дзятлавічы Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці.

Надвячоркам каля вясёлага вогнішча танцы змяняюцца старажытнымі і сучаснымі песнямі, мудрым купалаўскім вершам. А па сажалцы, што знаходзіцца за домам-музеям паэта, паплылі вянкі з веснавых кветак — сімвал купалаўскага свята.

Т. САХАШЧЫК,
наш спец. кар.

НА ЗДЫМКАХ: «гадзіну паэзіі» адкрывае А. А. ЛОЙКА; хлеб-соль госцю злёту — рэктару Белдзяржуніверсітэта, акадэміку АН БССР У. А. БЕЛАМУ ўручае салістка ансамбля «Вячоркі».
Фота **А. Стадуба.**

● ДРУЖБА — ФРОЙНДШАФТ

ПЛЁН СЯБРОЎСТВА

ЗАКОНЧЫЛАСЯ арганізаваная на базе філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна міністэрствамі вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, БССР, Міністэрствам народнай асветы ГДР і Белдзяржуніверсітэтам навукова-метадычная канферэнцыя выкладчыкаў ВНУ Савецкага Саюза і Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі «Тэорыя і практыка выкладання рускай і савецкай літаратуры студэнтам з ГДР».

Наш універсітэт — адна з буйнейшых навуковых устаноў, у якой стажыруюцца будучыя выкладчыкі — русісты з братняй краіны. У школах, вучылішчах, інстытутах, універсітэтах, іншых навуковых і культурных установах ГДР сёння працуюць больш за 300 спецыялістаў па рускай мове і літаратуры, падрыхтаваных у БДУ.

Прадстаўнікі 11 ВНУ СССР і 7 ВНУ ГДР прынялі ўдзел у канферэнцыі, на якой заслухана і абмеркавана больш 70 дакладаў і паведамленняў. Аб рабоце секцыі «Метадалагічныя і метадычныя праблемы выкладання рускай і савецкай літаратуры студэнтам з ГДР» расказвае яе старшыня, прафесар Карл Хайнц Каспер (Лейпцыг):

— Праблемы выкладання рускай і савецкай літаратуры студэнтам з ГДР з улікам будучай работы ў школе, спецыфіка лекцыйных курсаў савецкай літаратуры для розных форм навучання студэнтаў з ГДР, мэты, змест і структура курса «Уводзіны ў літаратуразнаўства», неабходнасць стварэння спецыяльнай метадычнай літаратуры для стажораў — вось далёка не поўны пералік пытанняў, якія хвалявалі ўдзельнікаў пасяджэнняў першай секцыі.

Доктар Каспер падкрэсліў, што за 5 дзён працы, увабраўшай навуковыя даклады, цікавыя сустрэчы, карысныя гутаркі, умацаваліся сяброўскія сувязі.

Пераход вышэйшай школы ГДР на новыя вучэбныя планы і праграмы ставіць перад вышэйшымі навучальнымі ўстановамі СССР, у якіх стажыруюцца замежныя студэнты, і перад ВНУ ГДР складаныя задачы, якія патрабуюць пераходу на якасна новы ўзровень работы. Нямецкія калегі азнаёмілі ўдзельнікаў канферэнцыі са структурай новых падручнікаў па рускай літаратуры, выдадзеных у ГДР.

У ходзе абмеркавання прадстаўленых дакладаў была адзначана неабходнасць пераемнасці ў навучанні студэнтаў-русістаў, дакладнай каардынацыі вучэбнай работы лінгвістычных і літаратурных кафедр, умацавання сувязей паміж грамадскімі і філалагічнымі дысцыплінамі; стварэння вучэбных дапаможнікаў па рускай і савецкай літаратуры, рускай мове, навуковаму камунізму і іншых дысцыплінах, прадугледжаных вучэбнымі планамі для студэнтаў з ГДР, дапаможнікаў, якія больш поўна ўлічвалі б спецыфіку гэтага тыпу навучання.

Т. АЛЯКСАНДРАВА.

На здымку: заключнае пасяджэнне канферэнцыі.

Фота **У. Будая.**

● АДКРЫТАЕ ПІСЬМО

УСПОМНІЦЕ, КАЛІ ЛАСКА!

Паважаныя камендант інтэрната № 7 Алена Аляксееўна Левашкова і члены студсавета! Вы, напэўна, ужо забыліся, што абяцалі нам тэрміновы адказ рэдакцыі на крытычнае выступленне, якое было змешчана у № 12 (1312) «Беларускага універсітэта» 26 сакавіка 1981 года. Часу прайшло багата з таго моманту, а ад вас — ні слуху, ні духу. Што здарылася! Не хапае смеласці прызнаць свае ўпушчэнні ў рабоце! Ці вы так заняліся выпраўленнем становішча з выкарыстаннем электраэнергіі, што ні да чаго іншага рукі не даходзяць! А можа вы арыентуецеся на вядомы выраз: абяцанага тры гады чакаюць!

Дарэмна. Вельмі дарэмна. І каб запэўніць вас у гэтым, нагадаем, што мы чакаем ад вас падрабязнага рэагавання аб прынятых мерах па барацьбе са злоўжываннем выкарыстання электрычнай энергіі. Урэшце — гэта ваш прамы службовы абавязак, паважаная Алена Аляксееўна. А вы, відаць, як сведчыць доўгае маўчанне, забыліся і пра яго.

● ТВАЯ ГРАМАДСКАЯ ПРАФЕСІЯ

ПАДВОДЗЯЧЫ ВЫНІКІ

НА СПРАВАЗДАЧНАЙ канферэнцыі факультэта грамадскіх прафесій дэкан У. Пузікаў і кіраўнікі аддзяленняў падвялі вынікі чарговага навучальнага года.

Факультэт грамадскіх прафесій створаны ва універсітэце ў 1964 годзе. Яго задачы — навучанне студэнтаў другой грамадскай спецыяльнасці, прыцягненне да прапаганды палітычных, мастацкіх, навукова-тэхнічных ведаў, развіццё ў студэнтаў эстэтычных поглядаў і густу.

У гэтым годзе на факультэце грамадскіх прафесій працавала трынаццаць аддзяленняў: фотакарэспандэнтаў, кінааператараў, інструктараў па спорту, харэаграфіі, мастацкага слова, дыктараў і вядучых, бальнага танца, мастакоў-афарміцеляў, арганізатараў ваенна-патрыятычнай работы, кіраўнікоў агітбрыгад, журналістыкі, школа маладога лектара, школа арганізатараў грамадска-палітычнай работы.

Методыка правядзення заняткаў вызначана спецыфікай таго ці іншага аддзялення. У школе маладога лектара чытаюцца лекцыі, слухачамі распрацоўваюцца тэксты дакладаў з наступным выступленнем перад насельніцтвам ці ў вучэбнай групе. Кінааператары набываюць тэарэтычныя і практычныя веды ў лабараторыях, а затым замацоўваюць іх, выконваючы натурныя здымкі.

Узаемасувязь тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі слухачоў факультэта дазваляе ім актыўна ўдзельнічаць у рабоце народнага ансамбля «Крыжачок», народнага тэатра універсітэта, праводзіць выстаўкі работ фотакарэспандэнтаў і мастакоў - афарміцеляў. Слухачы аддзялення суддзяў і інструктараў па спорту здзяйсняюць судзейства на агульнаўніверсітэцкіх спаборніцтвах. Школа маладога лектара правяла канферэнцыю, прысвечаную дню нараджэння У. І. Леніна.

Навучальны працэс у гэтым годзе забяспечваўся сіламі 60 прадстаўнікоў прафесарска-выкладчыцкага саставу універсітэта. Дапамагалі лектары таварыства «Веды», слухачы ІПК пры БДУ, работнікі культуры і мастацтва. Умацавалася матэрыяльная база факультэта.

Найбольш цікава працавала аддзяленне арганізатараў грамадска - палітычнай работы, пераўтворанае ў гэтым годзе ў школу АГПР, якая мае ў сваім саставе некалькі падраздзяленняў: арганізатараў унутрысаюзнай работы ВЛКСМ, арганізатараў грамадска-палітычнай практыкі і Ленінскага заліку, арганізатараў прафсаюзнай работы, арганізатараў лекцыйна-прапагандысцкай работы, арганізатараў адпачынку моладзі, арганізатараў грамадскай дапамогі сацыёлагам.

За актыўны ўдзел у рабоце факультэта грамадскіх прафесій камітэт камсамола БДУ імя У. І. Леніна ўзнагародзіў ганаровымі граматамі лепшых студэнтаў.

З творчай справаздачай выступілі мастацкія калектывы факультэта грамадскіх прафесій: падрыхтоўчая група ансамбля «Крыжачок», дэкламатары аддзялення мастацкага слова, дыктараў і вядучых, юныя гімнасткі.

Г. ФАЛЬКОЎСКАЯ,
метадыст ФГП.

● НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

20 УПЭЎНЕНЫХ КРОКАЎ

СВОЙ 20-гадовы юбілей адзначыла кафедра ядзернай фізікі.

20 год. Многа гэта ці мала? 20 год — гэта пачатак сталасці, гэта мноства добрых спраў і пачынанняў, велічнасць планаў на будучае. 20 год —гэта дваццаць адрэзкаў часу, за якія зроблена многа адкрыццяў, карысных спраў. Толькі за апошнія пяць гадоў аб'ём выконваемых работ узрос прыкладна на 100 тысяч рублёў у год; на 2 млн. рублёў у год павысіўся эканамічны эфект за пяцігодку. 26 аўтарскіх пасведчанняў у 1980 годзе супраць 6 у 1975 атрымалі супрацоўнікі кафедры ядзернай фізікі. Плённа працуе адкрытая тут нядаўна галіновая лабараторыя; па лініі кафедры спецыялізацыю вучэбнага працэсу забяспечваюць 6 прафесараў.

Са значнымі поспехамі прыйшлі да юбілею ядзершчыкі. Кафедра атрымала 3 Ганаровыя граматы Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, два студэнты— Ю. Шчэрбіч і А. Мяцеліца — сустракаюць 20-годдзе перамогай на рэспубліканскай фізічнай алімпіядзе студэнтаў, кафедра ўзнагароджана за актыўную работу па прымяненню тэхнічных сродкаў навучання.

На ўрачыстае пасяджэнне, якое адбылося ў час святкавання юбілею кафедры, былі запрошаны ганаровыя госці з усёй краіны, былыя выпускнікі, супрацоўнікі.

Да свайго свята фізікі-ядзершчыкі падрыхтавалі юбілейныя медалі і значкі, выпусцілі спецыяльны нумар кафедральнай насценгазеты. Тэлеграмы, віншавальныя адрасы, дасланыя на кафедру калегамі і былымі выпускнікамі, надалі святочнай абстаноўцы асаблівую ўрачыстасць.

С. ІВАНОВА.

Разам з савецкімі сябрамі адзначыў Дзень вызвалення Афрыкі студэнт з Конга Віктор Ітуа. Ён займаецца на 3-м курсе факультэта журналістыкі. Старанна спасцігае таямніцы прафесіі. Нядаўна паспяхова абараніў курсавую работу аб ролі дэмакратычных газет Афрыкі ў вызваленчай барацьбе. Фота **В. Шачака.**

ЛЕТАПІС БДУ

(Пачатак у №№ 4, 6, 7, 8, 10—20)

1969 год
Студзень

Выйшаў у свет першы нумар навуковага часопіса «Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна». Выданне адкрывае серыя «Гісторыя, філасофія, эканоміка, права».

25 лютага

Прысваенне звання Героя Сацыялістычнай Працы акадэміку Л. А. Арцімовічу (выхаванцу універсітэта) за вялікія заслугі ў развіцці савецкай навукі.

3 сакавіка

За вялікія заслугі ў развіцці савецкай навукі акадэміку АН БССР М. П. Яругіну прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

4 кастрычніка

Першы злёт байцоў студэнцкіх будаўнічых атрадаў універсітэта.

Снежань

Адкрыццё падрыхтоўчага аддзялення БДУ.

Студэнт матфака А. Гантварг заваяваў залаты медаль чэмпіёна краіны па шашках.

1970 год
9 студзеня

Пастанова ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР аб святкаванні 50-годдзя БДУ.

Сакавік

За заслугі ў фарміраванні і арганізацыі работы студэнцкіх будаўнічых атрадаў універсітэт узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Казахскай ССР.

7 красавіка

ЦК КПСС, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР, Савет Міністраў СССР і ВЦСПС узнагародзілі Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна ленінскай Юбілейнай Ганаровай граматай.

Снежань

Узнагароджанне універсітэта дыпломам I ступені ВДНГ СССР.

1971 год
1 лістапада

Урачыстае пасяджэнне ў Палацы спорту, прысвечанае 50-годдзю універсітэта. Першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў зачытаў прывітальнае пісьмо ЦК КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і Савета Міністраў БССР.

Кастрычнік

За поспехі ў развіцці вышэйшай адукацыі і навукі, падрыхтоўцы і выхаванні спецыялістаў для народнай гаспадаркі і культуры і ў сувязі з 50-годдзем з дня заснавання універсітэт узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

У сувязі з 50-годдзем ЛКСМБ камсамольская арганізацыя БДУ ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

За вялікія заслугі ў развіцці савецкай навукі званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена А. Н. Сеўчанку.

(Працяг будзе).

КЛІКАЦЬ ЗА САБОЙ

Агітбрыгада. Саюз энтузіястаў, аб'яднаных творчым натхненнем, пошукам, маладым запалам. Якой яна павінна быць, што з'яўляецца галоўным пры яе стварэнні, падборы рэпертуару і г. д.?

Сваімі пажаданнямі, меркаваннямі аб гэтым дзеляцца сёння на старонках газеты некаторыя з удзельнікаў і кіраўнікоў агітбрыгад студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

Т. Кантаровіч, кіраўнік агітбрыгады СБА «Расінка»:

— У агітбрыгадзе я ўдзельнічаю ўжо чацвёрты год, і таму мае думкі грунтуюцца іменна на гэтым вопыце. Першае, і самае галоўнае — правільны выбар тэмы. Лічу абавязковым патрабаванне: яна павінна хваляваць саміх артыстаў. Калі вам самім сумна слухаць тое, што вы гаворыце, зала адразу заўважыць няшчырасць, а тады — немінучы крах выступлення.

Другая ўмова яркай, трапнай агітпраграмы — дакладны падбор матэрыялу і добры сцэнарый. Няхай знайсці матэрыял дапамогуць знаўцы літаратуры, але пісаць сцэнарый трэба самім членам агітбрыгады. І неабходна падрабязна абмяркоўваць сцэнарый з усімі рабятамі. Гэта не фразы, гэта — адлюстраванне думак усіх членаў нашага калектыву. Неабходна выпакутаваць словы, якія вы скажаце са сцэны, каб гледачам не сядзелася ў зале ўтульна, каб яны разам з героямі, з выступаючым пранікліся сэнсам таго, што адбываецца, што імкнецца паказаць артыст, каб яны разам змаглі перажыць з вамі і боль, і трывогу, і радасць.

Пытанне, якое заўсёды выклікае найбольшую колькасць спрэчак,— форма падачы матэрыялу. Даўно вядома, што змест ніколі нельга аддзяляць ад формы, і я лічу, што аднолькава ганебна выходзіць на сцэну як з нізкапробнай па зместу, так і з «бульварнай» па форме праграмай.

І апошняе, з чаго, зрэшты, трэба было б пачаць. У чым мэта выступлення агітбрыгады? (Я ўвесь час маю на ўвазе агітпраграмы, а не вясёлыя канцэрты, якія даюцца ў час абедзеннага перапынку, хоць і да іх трэба ставіцца з усёй адказнасцю). Мэта ў тым, каб прымусіць гледача задумацца над пастаўленымі праблемамі (дарэчы, сфармуляванымі ясна і дакладна). Мэта дасягнута, калі выступленне пасеяла ў душы гледача зерне неспакою, неабыякавасці. Трэба памятаць: гэта АГІТ-брыгада! Яна павінна клікаць за сабой.

А. Даніловіч, удзельнік агітбрыгады СБА «Світанак»:

— Як і сам атрад, наша агітбрыгада — яшчэ вельмі малады калектыў. На прайшоўшым аглядзе-конкурсе агітбрыгад СБА мы выступілі не вельмі ўдала, але для нас стала важным тое, што мы зразумелі свае недахопы, убачылі, што яшчэ трэба дарабіць і як, усвядомілі сутнасць і задачы агітбрыгады. І мне здаецца, неабходна больш патрабавальна аналізаваць моцныя і слабыя бакі свайго выступлення, цярпліва вырошчваць парасткі новага, станоўчага, нешта выпраўляць, нешта ламаць, а галоўнае — ставіць перад сабой актуальную задачу, няхай нават і цяжкавырашаемую. Любая тэма павінна гучаць са сцэны сучасна, абуджаць думку, дапамагаць глыбей усведамляць сэнс эпохі, у якую мы жывём, умацоўваць у чалавеку высокія маральныя ідэалы.

Т. Засіменка, баец СБА «Стэлуца»:

— У аглядзе-конкурсе, які адбыўся, прымала ўдзел і агітбрыгада СБА «Стэлуца» мехмата.

Вынік нашай творчасці — 4-е месца з 12. Хоць гэта не лепшы рэзультат, але не месца — галоўнае. У час падрыхтоўкі выступленняў, канцэртаў мы больш даведаліся адзін аб адным, паспелі пасябраваць. Творчы ўздым, бадзёрыя, радасныя твары ўдзельнікаў і гарачыя апладысменты балельшчыкаў — вышэйшая ўзнагарода для нас.

На здымку: выступае агітбрыгада «Спадчына».

Фота **В. Шачака.**

● СПОРТ

У спаборніцтвах па фехтаванню на рапірах (у рамках універсітэцкай спартакіяды) перамагла каманда студэнтаў-фізікаў. Другое месца ў асабістым заліку належыць члену гэтай зборнай, чацвёртакурсніцы Ганне Авяр'янавай.

Фота **В. Шачака.**

Поспех гімнастак

ЧАТЫРЫ ДНІ ў спартыўнай зале БПІ праходзіла першынство рэспублікі сярод ВНУ па мастацкай гімнастыцы. Каманда Белдзяржуніверсітэта ўступіла толькі гаспадарам пляцоўкі — спартсменам політэхнічнага інстытута. У састаў каманды БДУ ўваходзіла пяць спартсменак: Ірына Білейчык, Лілія Бараздзіна, Наталля Журко, Алена Падкапаева і Вольга Ліпень. У жніўні дзяўчаты будуць абараняць гонар нашай рэспублікі на Усесаюзных студэнцкіх гульнях, падрыхтоўка да якіх з'яўляецца для універсітэцкай каманды асноўнай мэтаі.

Чацвёртае — ганаровае

КАМАНДА Белдзяржуніверсітэта па лёгкай атлетыцы, якая ўдзельнічала ў першынстве рэспублікі сярод ВНУ, заняла чацвёртае месца. Спаборніцтвы праходзілі на стадыёне «Дынама». Першымі былі спартсмены ГДУ, другімі — МРТІ і трэцімі — спартсмены інстытута фізічнай культуры. У нашай камандзе паспяхова выступілі Марыя Войтава (дыск), Людміла Хмялеўская (ядро), Таццяна Бойка (скачкі ў вышыню).

●

ВІНШУЕМ каманду замежных студэнтаў па лёгкай атлетыцы, якая заняла другое месца ў сёмай спартакіядзе горада Мінска.

Падрыхтаваў С. ЛЫСКАВЕЦ.

● СПРАВЫ ІНТЭРНАЦКІЯ

Патрэбна ўдасканальваць

АД ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНЦКАГА САВЕТА ІНТЭРНАТА, ЯГО УМЕННЯ КІРАВАЦЬ І СВОЕЧАСОВА ПАДТРЫМЛІВАЦЬ ДОБРЫЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ Ў МНОГІМ ЗАЛЕЖЫЦЬ ЖЫЦЦЕ СТУДЭНТАЎ СВАІМ «ДРУГІМ ДОМЕ». ЗРАЗУМЕЛА, ЧАМУ ТАК ПРЫНЦЫПОВА ІШЛА РАЗМОВА НА СПРАВАЗДАЧАХ І ВЫБАРАХ ВА УНІВЕРСІТЭЦКІХ ІНТЭРНАТАХ. НА ПЫТАННЕ «ЧЫМ АДМЕТНА СЁЛЕТНЯЯ СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАЯ КАМПАНІЯ?» АДКАЗВАЕ НАМЕСНІК СТАРШЫНІ ПРАФКОМА УНІВЕРСІТЭТА В. А. БЯЛЯЕЎ:

Падведзены вынік дзейнасці ўсёй работы студсаветаў за прайшоўшы навучальны год па дастойнай сустрэчы XXVI з'езда КПСС, падрыхтоўцы да 60-годдзя БДУ імя У. І. Леніна.

Восем інтэрнатаў мае універсітэт, і зразумела, што ў кожным ёсць штосьці сваё, адметнае. Хацелася б адзначыць высокую працаздольнасць студсавета інтэрната № 6, дзе жывуць студэнты фізфака і ФПМ. Інтэрнат заняў І месца ў сацыялістычным спаборніцтве. Тут упершыню пачаў працаваць клуб аматараў навукі і мастацтва «Красавік». Нягледзячы на розныя цяжкасці, савет клуба стварыў і паказаў праграмы: «Свет Чурлёніса», «Шлях да вяршыні (сучасная дыскатэка)», «Знайдзі сваю песню». Апошняя, прысвечаная сучаснай самадзейнай песні, дэманстравалася два разы. І той факт, што жадаючыя трапіць хоць на адну з праграм запісваліся ў спецыяльную чаргу, гаворыць сам за сябе.

У гэтым годзе прайшло «вялікае перасяленне». Інтэрнаты замацаваны пастаянна за факультэтамі. Таму прыходзілася спачатку афармляць наглядную агітацыю, ленінскія пакоі, чытальныя залы. Работы шмат. І нас радуе, што перыяд «адаптацыі» мінуў.

Аднак ёсць свае складанасці. Спартыўна-аздараўленчая работа знаходзіцца яшчэ не на патрэбным узроўні. Прайшла спартакіяда «Здароўе», але і гэтым спыняцца нельга.

Не хацелася б, каб ствараліся такія сітуацыі, як у інтэрнаце № 7. Вялікая актавая зала дае магчымасць праводзіць разнастайныя масавыя мерапрыемствы. Але вось бяда — няма крэслаў. Шмат яшчэ патрэбна папрацаваць, каб жыццё студэнтаў стала больш цікавым і змястоўным.

Запісаў М. ЛАХВІЧ.

ЯК РАШЫЦЬ РЭБУС?

● ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

САПРАЎДЫ, праблема, закранутая студэнтам факультэта журналістыкі С. Шаўцовым («Беларускі універсітэт», № 20) важная, хоць новай яе не назавеш. Пытанне грашовай прыбаўкі да саракарублёвай стыпендыі востра стаіць перад большасцю студэнтаў. Аднаму патрэбна карміць сям'ю, другому — жыць «незалежна» ад бацькоў, многім — для набыцця той ці іншай неабходнай рэчы. Вось таму і шукае студэнт для сябе работу, вось чаму будучыя фізікі і філолагі, хімікі і гісторыкі, юрысты і журналісты часова працуюць пажарнікамі і вартаўнікамі, кантралёрамі і паштальёнамі, грузчыкамі ў магазінах, на цацачнай фабрыцы, на паліграфічным камбінаце, на суседнім з інтэрнатам «Крышталі».

Але іншы раз пошукі работы займаюць тыдні, а то і месяцы, адбіваюць ахвоту і высакароднае імкненне быць карысным грамадству.

Перш чым пісаць гэты матэрыял, мы правялі нескладаны эксперымент: выслухалі меркаванні саміх студэнтаў. Большасць апытаных (у асноўным юнакі) ужо працуюць ці жадаюць спалучаць вучобу з працай. Ды толькі такую работу, якая магла б задаволіць студэнта, знайсці ў адзіночку не вельмі проста. Больш таго — складана.

Дзе ж выйсце з такога становішча?

Выступаючы нядаўна перад актывам СБА, сакратар камітэта камсамола універсітэта А. Рухля звярнуў увагу на неабходнасць узмацнення работы па працаўладкаванню студэнтаў. Гэта — стварэнне новых студэнцкіх службаў: інфармацыйнага бюро па працаўладкаванню, круглагадавых студэнцкіх атрадаў. Магчымасць для гэтага ёсць, неабходнасць — таксама. Але аднаму камітэту камсамола ці прафсаюзнаму камітэту універсітэта справіцца з гэтай задачай будзе цяжка. Тут патрэбна дзейсная дапамога камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый факультэтаў, саміх студэнтаў. Тады карысная і неабходная справа не заглохне, знойдзе сваіх прыхільнікаў і актывістаў.

А. ШЫБУТ,
начальнік штаба працоўных спраў.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

28 мая 1981 г.
АТ 02288 Заказ 890.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ